6. 张瑞芬，张天柱 《古代雕塑艺术的典范之作 - 跪射俑》陕西画报 2021: 47 – *Чжан, Жуйфэнь*. Модель древней скульптуры – статуи лучников, ведущих стрельбу с колена / Жуйфэнь Чжан, Тяньчжу Чжан. – Иллюстрированный журнал провинции Шэньси. – Шэньси, 2021. – 47 с.

# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ КАМПАЗІТАРАЎ З БЕЛАРУСКІМ РАДЫЁТЭАТРАМ У XXI ст.

***У. А. Трапянок,***
*кандыдат мастацтвазнаўства,*
*дырэктар дырэкцыі канала «Культура» генеральнага прадзюсарскага цэнтра Беларускага радыё, дацэнт кафедры рэжысуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Музыка радыёспектакля нароўні з голасам выканаўцы і шумавым афармленнем уваходзіць у трыяду асноўных выразных сродкаў драматычнага радыётэатра, узмацняе эмацыянальны пасыл твора, фарміруе яго агульную гукавую тканіну, рэалістычную праўдзівасць ці фантазійнасць, дапамагае стварыць ва ўяўленні слухача выключна індывідуальныя ўражанні.

Музычнае афармленне радыёспектакля ў працэсе яго рэалізацыі можна падзяліць на два віды – арыгінальнае (адмысловае напісанне музыкі) і кампіляцыйнае (цытатны прынцып). Увага ў артыкуле звернута на арыгінальнае музычнае афармленне сучасных драматычных радыёспектакляў, створанае прафесійнымі кампазітарамі. Згодна з тэорыяй радыётэатра, музыка ў якасці выразнага сродку твора можа ўплятацца ў сцэнарый як лагічны працяг аповеду героя ці папярэднічаць яго далейшым рэплікам (іманентная музыка), або аддзяляць адну сцэну ад іншай ці гучаць у якасці фону (трансцэндэнтальная музыка) [7]. У многіх беларускіх радыётворах адбываецца чаргаванне названых відаў музыкі.

Гісторыя сусветнага станаўлення драматычнага радыётэатра пачыналася з падзелу «на галасы», затым у перадачу паступова ўводзіліся музыка і шумы. Падобным шляхам развіваўся беларускі радыётэатр, вельмі хутка ў яго быў уведзены музычны складнік. Кампазітарскі ўклад у айчынную радыёсправу аказаўся настолькі вялікім, што «на радыё, можна лічыць, нараджалася Беларуская дзяржаўная філармонія. Яе вытокамі быў

радыётэатр: артысты, якія групаваліся вакол радыё, пачалі даваць канцэрты <...>. Выканаўчыя сілы радыётэатра і сталі ядром створанай пазней Беларускай дзяржаўнай філармоніі» [1, с. 140].

Адным з першых кампазітараў, якія ўзаемадзейнічалі з айчынным радыётэатрам, можна назваць І. Любана. Ён быў мастацкім кіраўніком студыі «Радыётэатр», якая ўтварылася ў сярэдзіне 1930-х гг. у выніку аб'яднання сектараў літаратурна-драматычных і музычных перадач. У той час ішло актыўнае засваенне сродкаў мастацкай выразнасці драматычнага радыётэатра, вызначаліся ўзроўні стварэння радыётвораў (прадукцыйны і рэпрадукцыйны). На прадукцыйным узроўні пры ўдзеле прафесійных кампазітараў запісваліся арыгінальныя радыёспектаклі, літаратурна-мастацкія кампазіцыі, радыёінсцэніроўкі і г. д.

Кампазітар А. Туранкоў напісаў музыку для радыёспектакля рэжысёра Л. Алендэра «Прыгавор будзе». Даследчык гісторыі Беларускага радыё Я. Радкевіч адзначаў, што «п'еса пачынаецца момантам, калі паўстанне задушана. Для таго, каб надаць больш дзейнасці і сілы падзеям, кампазітар А. Туранкоў напісаў пралог, які малюе паўстанне і паражэнне. У адным месцы рабочы Фальке маўкліва выказвае пачуццё нянавісці да фашызму. Але як гэта выказаць перад мікрафонам? Для гэтага кампазітар напісаў "Песню Фальке", якая без слоў выказвае яго думкі. Фінал п'есы акцэнтуецца "Маршам адзінага фронту", які гаворыць пра блізкую перамогу пралетарыяту» [5, с. 55].

Функцыі музыкі ў радыётэатры з гадамі не змяніліся – яны падкрэслівалі псіхаэмацыянальны стан герояў, узмацнялі атмасферу твора. З'яўленне запісу на магнітную плёнку ў канцы 1940 – пачатку 1950 гг. паслужыла стартам новага этапу развіцця беларускага радыётэатра, які характарызаваўся творчымі і тэхнічнымі эксперыментамі, спробамі і пошукамі найбольш арганічнага і дасканалага спалучэння выразных сродкаў радыёвяшчання праз выкарыстанне мантажу. Мантаж стаў вызначальным спосабам мастацкага асэнсавання рэчаіснасці і ўвасаблення на радыё ідэйна-мастацкіх канцэпцый рэжысёраў, гукарэжысёраў і іншых супрацоўнікаў радыё, што былі задзейнічаны ў падрыхтоўцы літаратурна-драматычных перадач і радыёспектакляў. Больш смелыя эксперыменты адбываліся падчас выкарыстання ў творах музыкі. У якасці прыкладу можна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прывесці радыёпастаноўку 1957 г. рэжысёра П. Данілава «Пунсовыя ветразі» па аднайменнай аповесці-феерыі А. Грына. Спектакль насычаны праўдзівымі гукавымі «дэкарацыямі», што дазваляюць слухачу апынуцца, напрыклад, у бушуючым моры ці, наадварот, у спакойным ручаі. Дапаўняе атмасферу пастаноўкі музыка кампазітара Л. Абеліёвіча, песні герояў надаюць твору лёгкасці і ўзвышанасці. Над запісам музычнага афармлення спектакля працавалі аркестр пад кіраўніцтвам Б. Куніна і хор Беларускага радыё [7].

Арыгінальную музыку для радыётэатра (музычнага і драматычнага) у XX ст. пісалі М. Аладаў, У. Алоўнікаў, А. Багатыроў, А. Мдывані, П. Падкавыраў, Л. Свердэль, А. Туранкоў, М. Чуркін [8]. Свой уклад у развіццё айчыннага драматычнага радыётэатра ў 1950–1980-я гг. унеслі таксама Я. Глебаў (радыёспектаклі «Яўген Пешкаў», «Адчыніце, казляняткі»), І. Лучанок («Мінскі напрамак», «Федзькава раніца», «Родныя дзеці», «Новая зямля»), У. Буднік («Дзятлава абнова», «Сонейка, свяці»), А. Залётнеў («Паром на бурнай рацэ», «Іду да цябе», «Пушча» і інш.), У. Кандрусевіч («Дар ляснога цара», «Кошка, якая гуляла сама па сабе», «Казкі старога дома», «Неруш») і інш. Запіс музыкі для радыётэатра адбываўся пры дапамозе створанага ў 1958 г. эстрадна-сімфанічнага аркестра Беларускага радыё і тэлебачання. У апошняе дзесяцігоддзе XX ст. з драматычным радыётэатрам супрацоўнічалі Д. Далгалёў («Пэпі Доўгаяпанчоха», «Незачэпа»), Д. Еўтуховіч («Следчая справа Вашчылы», «Сіняя світа налева пашыта»), У. Кур'ян («Гульня ў джын», «Па блакітных хвалях васількоў»), Л. Смялкоўскі («Не кажы гоп») і інш.

Традыцыя ўдзелу кампазітараў у падрыхтоўцы арыгінальных радыёспектакляў захавалася і ў XXI ст. Да пастаноўкі «Паэт і дзяўчына» (2007) па п'есе П. Васючэнкі музыку напісаў Л. Захлеўны. Кампазітар адзначаў, што працэс быў хуткім і лёгкім, паколькі яму вельмі блізкая творчасць Я. Купалы, якому прысвечаны спектакль, ствараць музыку на словы класіка «было надзвычайнай радасцю» [3]. На нашу думку, песні ў выкананні салістаў ансамбля «Бяседа» не вельмі ўдала ўпісаліся ў агульную карціну гістарычнага радыётвора, пабудаванага на ўспамінах П. Мядзёлкі, паколькі гучалі як самастойныя сучасныя музычныя кампазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Над музыкай да радыёспектакля «Крыж» па п'есе А. Дударава працаваў кампазітар У. Кандрусевіч. Яго музычны матэрыял падтрымлівае і суправаджае атмасферу твора, на многія сцэны і для галоўных герояў была прапісана свая тэма. Напрыклад, музыка Прадславы (Еўфрасінні) носіць лірычны, светлы характар, які дадае вобразу набожнасць, душэўную чысціню. Вакаліз на словы вядучага падкрэслівае хрысціянскую тэматыку радыётвора, жаночы спеўны голас можна трактаваць як сімвал нябачнай, але пастаяннай прысутнасці святой.

Кампазітар У. Саўчык напісаў музыку да спектакля «Млечны шлях» (2014) па рамане К. Чорнага ў інсцэніроўцы П. Васючэнкі. Спецыяльна створаная аднайменная сімфонія ў выкананні сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам Ю. Караваева мае пераважна спакойны, «касмічны» характар, што надае твору надзвычайную ўзнёсласць, рамантычнасць, сцішанасць, нягледзячы на ваенную тэматыку, якая ўздымаецца ў творы. Кампазітар сам падкрэсліваў, што з першых нот чуецца святло Млечнага Шляху, які пасылае на Зямлю нябесную мелодыю, нібыта размаўляе з сучаснікамі мовою продкаў і вечнасці, падтрымлівае нас. Імкненне У. Саўчыка – перадаць «інтанацыю сардэчнасці, спавядальнасці аўтара, якая ёсць у К. Чорнага. Калі ўважліва прачытаць раман, то адчуеш, што пісьменнік як бы спавядаецца перад Усявышнім, перад кожным з нас. І для кампазітара гэта дае незвычайную форму выказвання, пранікнёнасці, даходлівасці да сэрца: музыка павінна ісці ад сэрца да сэрца, як і кожнае слова рамана. Складана выбудаваныя характары, глыбокі канфлікт у сітуацыі, калі вайна і жыццё, і смерць – усё сплецена ў адзіны вузел» [2].

Таксама У. Саўчык напісаў музыку для радыёспектакля «Воўчая зграя» (2019) па аповесці В. Быкава. На гэты раз музыка кампазітара ў выкананні сімфанічнага аркестра і акадэмічнага хору Белтэлерадыёкампаніі вылучалася напружаннем, драматызмам, яна падкрэслівала адчуванні страху, чалавечага неспакою ва ўмовах барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У спектаклі «Воўчая зграя» музыка часта выходзіла на пярэдні план і досыць працягла гучала да заканчэння музычнай тэмы, што ламала тэмпарытм твора і стварала ўражанне спецыяльнага расцягвання спектакля [6].

Радыёспектакль «Танец з рапірай» (2018) па п'есе Я. Конева аформлены арыгінальнай музыкай кампазітара В. Падгайскай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Музычны матэрыял у выкананні В. Падгайскай (раяль) і сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам У. Авадка выкарыстаны ў якасці фону, што падмацоўвае атмасферу розных па характары сцэн (рамантычных адносін паміж школьнікамі Аленай і Валеркам, эмацыянальнага напружання ў выніку канфлікту з няпрыяцелямі, унутранай сканцэнтраванасці Алены на рынгу, душэўнага спакою падчас успамінаў дарослай Алены Смолікавай), а таксама аддзяляе сцэны адна ад адной. Гэта яскравы прыклад ужывання трансцэндэнтальнай музыкі ў сучасным радыёспектаклі. У канцы твора гучыць песня на музыку гукарэжысёра С. Бутоўскага і словы Я. Конева. Лёгкая мелодыя, напісаная ў параўнанні з музычным афармленнем у іншай стылістыцы, даволі арганічна ўплецена ў агульную структуру спектакля і падкрэслівае яго сэнс.

У афармленні дзіцячай радыёпастаноўкі «Падарожжа ў краіну мурашоў» па п’есе Т. Мушынскай (2018) выкарыстана музыка кампазітара А. Літвіноўскага ў аўтарскім выкананні на электраінструменце. Музычны матэрыял дапамог стварыць атмасферу разнастайных казачных прыгод хлопчыка Віцькі ў мурашыным царстве.

Беларускі кампазітар Д. Далгалёў стварыў музыку да радыёспектакля «Найдорф» (2020) па аднайменнай аповесці І. Пташнікава ў інсцэніроўцы У. Сцяпана. Рэжысёр А. Вінярскі заўважыў, што напісана таленавітая музыка, музычны складнік – адна з дзеючых асоб спектакля [4]. Сапраўды, музыка гучыць часта і многа, суправаджае шматлікія маналогі аўтара, пераходзіць у сцэны з іншымі героямі, падкрэслівае эмацыянальную нагрузку твора, але не выводзіцца без патрэбы на першы план, што робіць яе ў параўнанні з галасамі выканаўцаў другаснай, дапаможнай. Музыку для радыёспектакля «Найдорф» выконваў сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі пад кіраўніцтвам А. Сасноўскага.

Такім чынам, гукавы «каркас» шматлікіх сучасных беларускіх радыёспектакляў, як і ў XX ст., ствараецца пры непасрэдным удзеле прафесійных кампазітараў. Для напісання арыгінальнай музыкі запрашаюцца як аўтары, якія ўжо маюць вопыт супрацоўніцтва з радыё (У. Саўчык, У. Кандрусевіч, Д. Далгалёў), так і пачаткоўцы ў гэтай справе (В. Падгайская). Іх музыка носіць традыцыйна прыкладны характар – найчасцей гу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чыць у якасці суправаджэння і працягу акцёрскіх эмоцый (іманентная музыка), узмацняе ўздзеянне аўдыяльных твораў на аўдыторыю слухачоў. Якасць гучання музычнага складніка сучасных радыёспектакляў забяспечваецца сімфанічным аркестрам Белтэлерадыёкампаніі.


*1. Мехаў, У.* Сустрэчы ў радыёстудыі / У. Мехаў. – Мінск : Мастац. літ., 1985. – 140 с.

*2.* Млечным шляхам Кузьмы Чорнага [Электронны рэсурс] // Звязда. – Рэжым доступу: https://zviazda.by/be/news/20140512/1399874427-mlechnym-shlyaham-kuzmy-chornaga. – Дата доступу: 14.06.2021.

*3.* Паэт і дзяўчына [Электронны рэсурс] // Издательский дом «Беларусь сегодня» – Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/paet-dzyachyna.html. – Дата доступу: 14.06.2021.

*4.* Премьера радиоспектакля «Найдорф» по повести Ивана Пташникова состоится на Первом канале Белорусского радио [Электронный ресурс] // Издательский дом «Беларусь сегодня». – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/povest-voennykh-let.html. – Дата доступа: 14.06.2021.

*5. Радкевіч, Я. Р.* Беларускае радыё: гісторыя, перспектывы развіцця / Я. Р. Радкевіч. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1983. – 198 с.

*6. Трапянок, У. А.* Асэнсаванне падзей Вялікай Айчыннай вайны ў сучасных спектаклях беларускага радыётэатра / У. А. Трапянок // Культура. Наука. Творчество : XIV Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 75-летию Великой Победы и 45-летию Белорус. гос. ун-та культуры и искусств (Минск, 14 мая 2020 г.) : сб. науч. статей / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2020. – С. 111–115.

*7. Трапянок, У. А.* Спецыфіка развіцця радыётэатра ў медыяпрасторы Беларусі / У. А. Трапянок ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2019. – 208 с.

*8. Шэін, В. М.* Радыётэатр / В. М. Шэін // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / пад агул. рэд. А. В. Сабалеўскага ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2003. – Т. 2 : Лабанок-Яшчур. – С. 290–291.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ